Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

16 лістапада 2015 года, № 19 (2143)

УРАЧЫСТАСЦІ

Прафесар Віктар Анішчык атрымлівае дыплом лаўрэата конкурсу імя А. Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых навук

Прафесар Алег Слука атрымлівае дыплом лаўрэата конкурсу імя У. І. Пічэты ў галіне гуманітарных навук

Са знакам якасці

У БДУ падведзены вынікі конкурсу на суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі ў намінацыі «Навука»

Званнем *лаўрэатаў прэміі імя А. Н. Сеўчанкі* за цыкл прац «Новыя тэарэтычныя і эксперыментальныя вынікі ў прыкладных рэнтгеназструктурных даследаваннях» ганараваны аўтарскі калектыў фізічнага факультэта: дэкан фізічнага факультэта **Віктар Анішчык,** загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі **Ілья Феранчук,** дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі **Андрэй Бенедыктовіч** і дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела **Мікалай Чаранда.**

Звання *лаўрэата прэміі імя У. І. Пічэты* ўдастоены прафесар кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ Інстытута журналістыкі БДУ **Алег Слука.** Яго праца «Фундаментальнае даследаванне працэсу нацыянальнай камунікацыі» і серыя навуковай літаратуры пад агульнай назвай «Беларуская журналістыка» прызнана самай лепшай.

Адзначым таксама, прэміі імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі ў намінацыі «Навука» прысуджаюцца таксама і маладым навуковым БДУ. У гэтай катэгорыі на суісканне *прэміі імя А. Н. Сеўчанкі* перамагла праца «Сінтэз функцыяналізаваных паліметадамі кантраляванай іоннай і радыкальнай палімерызацыі». Даследаванні праводзілі маладыя навукоўцы НДІ фізікахімічных праблем БДУ **Ірына Васіленка, Дзмітрый Шыман і Юлія Піскун.**

Перамогу ў конкурсе на суісканне *прэміі імя У. І. Пічэты сярод маладых навукоўцаў* падзялілі дзве працы. Серыю даследаванняў па праблематыцы інавацыйнага развіцця сусветнай эканомікі з дапамогай новых формаў фінансавання і падтрымкі прадпрымальніцтва прадставіла намеснік дэкана па навуковай рабоце факультэта міжнародных адносін **Вольга Малашанкава.** Другім пераможцам стаў дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта **Андрэй Лукашэвіч.** Яго цыкл навуковых прац па ваеннай і палітычнай гісторыі Расіі, Беларусі і Польшчы XVIII – першай чвэрці XIX стст. прызнаны найлепшым.

Сёлета конкурсы праводзіліся ў намінацыі «Навука». Усяго ў камісію па прысуджэнні прэміі імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі было пададзена 8 прац ад 13 навукоўцаў.

Узнагароджанне пераможцаў конкурсу адбылося 30 кастрычніка на ўрачыстым пасяджэнні Савета БДУ, прысвечанага 94-годдзю ВНУ. Таксама 23 супрацоўнікам былі ўручаны пасведчанні і нагрудныя знакі «Заслужаны работнік БДУ» і 10 чалавек былі адзначаны падзякай рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі.

У нумары:

ВУЧЫЦЦА РАСКАВАНАСЦІ
Старшы выкладчык філфака Гардзей ХОМІЧ прызнаны «Найлепшым настаўнікам рускай славеснасці замежжа»
Стар. 2

ЗАСНАВАЛЬНІК ШКОЛЫ МЕТАДАЛОГІІ ГІСТОРЫІ
Прафесару кафедры крыніцазнаўства Уладзіміру СІДАРЦОВУ споўнілася 80 гадоў
Стар. 3

СТАРТ ДЛЯ БУДУЧАЙ КАР'ЕРЫ
На чарговым «Дні кар'еры» сотні студэнтаў розных спецыяльнасцяў чакалі новаўвядзенні
Стар. 4

Весткі з рэктарата

ВЫКАНАЎЧЫ сакратар Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН Крысціян Фрыіс Бах 6 лістапада наведаў БДУ. Ён сустрэўся з рэктарам Сяргеем Абламейкам, а таксама прачытаў лекцыю «Свет, устойлівае развіццё і роля ААН: як моладзь можа кіраваць зменамі?».

СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі НС РБ Міхаіл Мясніковіч 2 лістапада выступіў па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на сучасным этапе перад прафесарамі БДУ, дэканамі факультэтаў і загадчыкамі кафедраў, а таксама адказаў на пытанні.

ПРАРЭКТАР па навуковай рабоце акадэмік Алег Івашкевіч стаў ганаровым прафесарам Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта за ўнёсак у навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва. Алег Івашкевіч прыняў удзел у Першым міжнародным форуме па экалагічных праблемах у Кітаі, а таксама выступіў з лекцыяй перад выкладчыкамі і студэнтамі ДПУ і Чжэцзянскага Шужэнь універсітэта.

ПРАФЕСАР кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства Барыс Норман стаў ганаровым доктарам Плоўдзіўскага ўніверсітэта (Балгарыя) за ўнёсак у развіццё балгарыстыкі. Дыплом уручыў рэктар гэтай ВНУ Запран Казлуджоў у рамках Паісіевых чытанняў.

ПАДЗЯКА Міністэрства адукацыі абвешчана БДУ за арганізацыю І міжнароднай канферэнцыі «Студэнцкае самакіраванне: досвед і перспектывы», якая прайшла 21–22 кастрычніка. Была падрыхтавана выстава, прысвечаная дзейнасці БДУ ў галіне выхавання і сацыяльнай абароны студэнцкай моладзі. Папярэдне было прадстаўлена 20 прац спецыялістаў БДУ ў сферы арганізацыі працы з моладдзю. Тры распрацоўкі былі прадэманстраваны на форуме.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

АСОБЫ

Навуковец-філолаг – гэта асаблівы даследчык

Прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства **Барыс НОРМАН** з'яўляецца буйным даследчыкам у галіне філалогіі і лінгвістыкі. Нядаўна ён стаў ганаровым доктарам Плоўдзіўскага ўніверсітэта за развіццё балгарыстыкі. Пра тое, што такое мова і мовазнаўства сёння – у нашым інтэрв'ю.

Прафесар Барыс Норман (справа) з рэктарам Плоўдзіўскага ўніверсітэта Запранам Казлуджовым

– Барыс Юсцінавіч, наколькі асабіста значнае прысуджанае Вам званне ганаровага доктара?

– Гэта ацэнка перш за ўсё маіх заслуг і прац у сферы славянскага мовазнаўства і, у прыватнасці, балгарскай мовы. У 1966 г. я скончыў славянскае аддзяленне Ленінградскага ўніверсітэта, і першай маёй спецыяльнасцю была якраз балгарская мова, другой – руская, трэцяй – польская і г. д. Колькі працую ў БДУ, я займаюся пытаннямі балгарскай граматыкі, балгарскага маўленчага этыкету, балгарскіх камунікатыўных паводзінаў. Зараз у мяне каля 50 работ па балгарскай мове, у тым ліку дзве кнігі на дадзеную тэму. Калегі ацанілі гэта і прысудзілі высокае званне.

– Скажыце, балгарыстыка – гэта выключна навуковы інтарэс, або Вас звязвае з ёй таксама нешта большае – можа, асабістыя кантакты з балгарамі ці, напрыклад, сваяцтва?

– У мяне ніякіх каранёў, ніякіх такога роду стасункаў у Балгарыі няма, але паколькі чалавек, які займаецца замежнай мовай, павінен вывучаць і культуру, і гісторыю, і літаратуру краіны носьбітаў гэтай мовы, то цалкам натуральна, што такая цікавасць фарміруецца і ў працэсе навучання, і ў працэсе працы. Калі мы сёння рыхтуем новае пакаленне балгарыстаў або, напрыклад, паланістаў, багемістаў, мы вучым іх не толькі мове, мы вучым культуры краіны вывучаемай мовы, мы вучым павазе да гэтай краіны, мы вучым, калі так можна выказацца, любові да гэтай краіны. У мяне, вядома, ёсць вельмі глыбокая ўнутраная сімпатыя і цікавасць да Балгарыі, я там шмат разоў бываў, але гэта заснавана выключна на маёй прафесійнай дзейнасці.

– Што такое балгарыстыка ў Беларусі сёння? Наколькі яна развіта?

– Сёння балгарыстыка ў Беларусі – не самая профільная з усіх філалагічных дысцыплін. Вы, напэўна, ведаеце, што самы высокі конкурс сярод тых, хто паступае на філалагічны факультэт, – на аддзяленне кітайскай філалогіі, што можна зразумець і растлумачыць. Але сёлета мы набралі 14 чалавек на аддзяленне балгарскай мовы і літаратуры, і пакуль што яны падаюць пэўныя спадзевы.

А што тычыцца перспектыў маладых людзей – я вам скажу, што гэта ўжо пяты ў нас выпуск спецыялістаў па балгарскай мове і літаратуры, і папярэднія чатыры выпускі так ці інакш апраўдалі сябе. Нашы выпускнікі знаходзяць сабе вельмі розную працу: некаторыя з іх працуюць у гандлёвых фірмах, некаторыя займаюцца тэхнічным ці літаратурным перакладам, хтосьці выбраў сабе сферу турызму, а ёсць нават людзі, якія працуюць у дыпламатычных прадстаўніцтвах. Увогуле, мы забяспечваем Беларусь спецыялістамі па роднаснай славянскай мове і блізкай нам літаратуры і культуры.

– Ваша сфера навуковых інтарэсаў у мовазнаўстве, як вядома, вельмі шырокая і далёка не абмежавана балгарыстыкай. Гэта звязана з імкненнем асабіста спазнаць і апісаць такую велізарную з'яву, як мова, ва ўсіх яе праявах, ці гэта служэнне пэўнаму грамадскаму інтарэсу, імкненне сваёй працай запоўніць белыя плямы ў ведах?

– Навуковая праца – гэта сапраўды пазнанне свету, пазнанне грамадства і, калі заўгодна, пазнанне самога сябе. Да таго часу, пакуль чалавек займаецца навуковай працай, яму не сумна з самім сабой, яму цікава жыць. І, вядома, чым шырэйшыя яго навуковыя інтарэсы, тым ён лягчэй пераключаецца з адной навуковай сферы на іншую. Я сапраўды займаюся рознымі славянскімі мовамі, але акрамя таго мяне цікавіць і літаратура, і сумежныя сферы мастацтва, і нават спорт ...

– Спорт?

– Так, я вельмі люблю некаторыя віды спорту і вельмі доўга імі займаўся.

– Напрыклад?

– Напрыклад, у нашым універсітэце добра ведаюць маё захапленне баскетболам. А што тычыцца першага пытання… ёсць такі знакаміты выраз, па-мойму, акадэміка Арцымовіча, быў такі фізік. Ён сказаў, што навука – вельмі выгадны спосаб задавальнення прыватнай цікаўнасці за дзяржаўны кошт. Гэта трошку іранічна, але, па сутнасці, так і ёсць, бо чалавек, займаючыся навукай, часта робіць гэта не з-пад палкі, не таму, што яго прымушаюць гэта рабіць, а таму, што яму самому цікава. Таму, што тычыцца пытання пра тое, асабістаму ці грамадскаму інтарэсу падпарадкавана мая праца, я б сказаў: і так, і так. Тым больш што наша навука не нейкая схаластычнай сфера – яна вельмі цесна звязаная з сістэмай адукацыі. І калі я, напрыклад, адкрываю для сябе нейкую з'яву, закрываю нейкую белую пляму, і мне хочацца пра гэта расказаць, ну, дапусцім, у навуковым артыкуле, то я, вядома, шукаю магчымасць потым адлюстраваць гэта ў лекцыях для студэнтаў, каб ім было цікава.

Гутарыў
Сяргей МАЕЎСКІ

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Чытайце цалкам на gazeta.bsu.by

Вучыцца раскаванасці

Старшы выкладчык кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта **Гардзей ХОМІЧ** стаў пераможцам III міжнароднага конкурсу «Найлепшы настаўнік рускай славеснасці замежжа». Ён распавёў пра перамогу і пра навучанне культуры маўлення.

Першы міжнародны конкурс падобнага кшталту праводзіўся ў 2013 г. толькі для настаўнікаў школ з краін СНД. Абсалютным пераможцам стала наша суайчынніца Іна Віннік са Сноўскай СШ. Другі конкурс быў сярод выкладчыкаў школ і ВНУ далёкага замежжа. Трэці конкурс, які прайшоў 23 кастрычніка 2015 г., аб'яднаў удзельнікаў з краін СНД, Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі і праводзіўся пры падтрымцы Рассупрацоўніцтва.

«Трэба было прадэманстраваць свае метадычныя магчымасці ў арганізацыі навучальнай дзейнасці, гэта значыць паказаць фрагмент заняткаў. Правяраўся ўвесь комплекс ведаў і навыкаў выкладчыка школы або ВНУ. Ёсць, напрыклад, конкурсы, якія ацэньваюць толькі напісанае эсэ. Такія мне не вельмі цікавыя», – распавёў Гардзей.

Міжнародны конкурс праводзіўся ў два этапы. На завочным за вызначаны час выконвалі тэст з 40 пытанняў. Далей трэба было напісаць эсэ і скласці сем тэзісаў пра тое, навошта вывучаць рускую славеснасць. У выніку з больш за 600 выкладчыкаў рускай мовы з 60 краін выбралі 15 фіналістаў, якіх запрасілі ў Маскву.

«У фінале нам прапанавалі два заданні. Першае: прэзентацыя таго, як мы выкладаем рускую мову. У якасці другога задання трэба было на працягу шасці хвілін паказаць фрагмент урока на тэму: «Чалавек у рускай літаратуры» з апорай на прэзентацыю», – распавёў Гардзей.

Пра прэзентацыю і сумленне

У прэзентацыі Гардзей акцэнтаваў увагу на розныя кірункі працы выкладчыка рускай мовы, таму што ён вучыць не толькі маўленню. «Па-першае, гэта знаёмства з рускай культурай. Па-другое, развіццё эмацыйнай сферы асобы. Па-трэцяе, развіццё эстэтычнага густу студэнтаў», – кажа выкладчык.

У фрагменце ўрока ён вырашыў спыніцца на такой якасці рускага і не толькі чалавека, як сумленне. Паказаць, як гэта якасць выяўляецца ў жыцці герояў рускай літаратуры XIX–XX стст., і зрабіць паралелі з жывапісам.

«Ёсць выдатная карціна рускага мастака Мікалая Ге, якая называецца «Сумленне Іуды». Я думаю, яно, сумленне, закладзена ўсярэдзіне кожнага чалавека. Толькі ў некаторых людзей яно спіць. І трэба знайсці пэўны падыход, каб гэта сумленне прачнулася. Я шчыра веру, што ў большасці людзей яно ёсць», – адзначыў Гардзей.

Пра найлепшую лінгвістычную школу

На конкурсе прадстаўнікі ўсіх краін заканчвалі рускамоўныя ВНУ, таму па-руску размаўлялі ўсе выдатна. Удзельнікі і зараз падтрымліваюць сувязь праз інтэрнэт.

«Людзі насамрэч падабраліся вельмі цікавыя. У кожнага можна было павучыцца. Усе канкурсанты выкладалі рускую мову праз прызму сваёй нацыянальнай культуры. Наконт іх метадычнага досведу магу сказаць, што сапраўды ёсць моцныя школы, але наша лінгвістычная і метадычная школа не саступае ні еўрапейскім, ні азіяцкім», – мяркуе Гардзей.

Пра тое, чаму стаў выкладаць

«Падчас вучобы ў Ліцэі БДУ атрымаў дыплом на рэспубліканскай алімпіядзе па рускай мове, дзякуючы таму, што вучыўся ў выдатнага выкладчыка – дацэнта філалагічнага факультэта Таццяны Ігнатовіч. Менавіта пад яе кіраўніцтвам пісаў усе свае навуковыя працы падчас вучобы на філфаку БДУ», – распавёў Гардзей Хоміч. Ён атрымаў спецыяльнасць выкладчыка рускай мовы і літаратуры і цяпер вядзе заняткі на філалагічным і гуманітарным факультэтах. Асноўныя кірункі: рыторыка, стылістыка і культура маўлення, методыка выкладання рускай мовы як у беларускіх, так і ў замежных студэнтаў.

– Хто лепш ставіцца да культуры маўлення?

– У замежных студэнтаў культуру маўлення можна фарміраваць, а ў беларускіх студэнтаў яна ў ідэале – застаецца толькі шліфаваць. Таму складана сказаць, якая з груп студэнтаў больш вылучаецца.

– Што цяжэй: пачынаць ці шліфаваць?

– Я думаю, што шліфаваць. Таму што прымусіць чалавека перавучыцца не толькі мове, але і чаму заўгодна, я думаю, нашмат складаней, чым пабудаваць з нуля.

– Як трэба адшліфоўваць мову, каб выйграць у міжнародным конкурсе?

– Я думаю, што гэта быў не асноўны, а спадарожны фактар. Мне вельмі спатрэбіліся тыя веды, якія я атрымаў на філфаку. У тым ліку ў методыцы выкладання рускай мовы. Шмат у чым гэта заслуга нашых універсітэцкіх выкладчыкаў.

– Што хацелася б прыўнесці ў сваё выкладанне, выкарыстоўваючы досвед замежных калегаў?

– Манеру выкладання. Мне здаецца, што еўрапейскія выкладчыкі больш раскаваныя чым беларускія, калі праводзяць лекцыі. У добрым сэнсе гэтаму трэба вучыцца.

– Як навучыць выкладчыкаў быць больш раскаванымі?

– Я думаю, што хутчэй не выкладчыка трэба вучыць раскаванасці. Хутчэй сістэма адукацыі павінна дапамагчы выкладчыку пачувацца так. І я перш за ўсё маю на ўвазе не ўніверсітэцкую, а школьную адукацыю. Якраз-такі ў ВНУ я такіх праблем не адчуваю. Але, калі два гады працаваў у школе, пэўныя абмежаванні для свабоды творчасці былі. Калі малады выкладчык прыходзіць у школу, ён сутыкаецца з мноствам папер, значная частка якіх не патрэбная. Ён змушаны кожны дзень запаўняць такую колькасць папер, што ў яго фізічна не застаецца часу для творчасці. Па-другое, ён страчвае цікавасць да працы. Калі могуць пазбавіць прэміі толькі за тое, што ў класным журнале стаіць кропка пасля назвы тэмы, а яе ставіць не трэба, мне здаецца, гэта ўжо перагін. У БДУ такога, на шчасце, няма.

Гутарыла
Фаіна НАКАНЕЧНАЯ

ЮБІЛЕІ

Заснавальнік школы метадалогіі гісторыі

Прафесару кафедры крыніцазнаўства, доктару гістарычных навук **Уладзіміру СІДАРЦОВУ** споўнілася 80 гадоў.

За без малога паўстагоддзя працы Уладзімір Нікіфаравіч пакінуў вялікі след у развіцці гістарычнага факультэта БДУ. У. Н. Сідарцоў з'яўляецца буйным спецыялістам у галіне тэорыі і метадалогіі пазнання і ўсеагульнай гісторыі. Менавіта яму належыла ідэя стварэння кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства. Прафесар У. Н. Сідарцоў стаў першым загадчыкам кафедры (1992). Пад яго кіраўніцтвам была арганізавана першая на постсавецкай прасторы спецыялізацыя студэнтаў па гістарычнай інфарматыцы. Дзякуючы высілкам У. Н. Сідарцова створана навуковая школа па метадалогіі гісторыі.

У. Н. Сідарцоў – заслужаны работнік адукацыі Беларусі, аўтар каля 350 навукова-метадычных публікацый і навучальных дапаможнікаў, у тым ліку каля 20 кніг. У 2013 г. выйшла яго манаграфія «Навуковы дыскурс гісторыка: сацыяльная абумоўленасць і метадалогія даследавання».

Уладзімір Нікіфаравіч нарадзіўся ў вёсцы Клімаўка Гомельскага раёна ў сям'і дырэктара няпоўнай сярэдняй школы і сакратара мясцовай партыйнай арганізацыі. З пачаткам вайны яго бацьку заклікалі ў войска, а маці з Уладзімірам і малодшым сынам Валерыем прыйшлося перажыць акупацыю. Па ўспамінах У. Н. Сідарцова, яны не раз знаходзіліся «на валаску ад смерці» і былі змушаны пераехаць да бабулі ў Навабеліцу.

З 1942 г. У. Н. Сідарцоў вучыўся ў школе на акупаванай тэрыторыі «па савецкіх падручніках, але з выразанымі партрэтамі нашых правадыроў і забруджанымі чорнай фарбай іх прозвішчамі...». Яго бацька скончыў вайну ў Кёнігсбергу намеснікам камандзіра асобнага батальёна сувязі. Затым дывізію бацькі перадыслакавалі ў Кіраў на р. Вятку, куды прыехала і маці з двума сынамі.

Пасля школы У. Н. Сідарцоў у 1953 г. паступіў на гістарычны факультэт БДУ. Падчас вучобы найбольш моцны ўплыў на яго светапогляд аказаў спецыяліст па сусветнай гісторыі прафесар Л. М. Шнеерсон. Пасля заканчэння гістфака У. Н. Сідарцоў працаваў настаўнікам гісторыі, завучам і дырэктарам у сярэдняй школе. У 1962 г. ён паступіў у аспірантуру Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе пад кіраўніцтвам прафесара М. А. Карнатоўскага абараніў у 1968 г. кандыдацкую дысертацыю.

Затым працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам і дацэнтам гістарычнага факультэта БДУ.

У 1988 г. У. Н. Сідарцоў абараніў доктарскую дысертацыю па тэме: «Працоўны клас Беларускай ССР у кіраванні дзяржавай (1921–1941 гг.)», пасля чаго ў 1991 г. становіцца прафесарам, а ў 1992 г. стварае кафедру крыніцазнаўства і музеязнаўства. Дзевяць гадоў У. Н. Сідарцоў кіраваў кафедрай, прыцягваючы новыя навуковыя сілы для чытання курсаў будучым архівістам і музеязнаўцам.

У 1990-я гг. Уладзімір Нікіфаравіч глыбока цікавіцца праблемамі метадалогіі гісторыі, гістарычнай інфарматыкі, псіхагісторыі. З 1993 г. У. Н. Сідарцоў узначаліў Беларускае аддзяленне Расійскай асацыяцыі «Гісторыя і камп'ютар», а з 1997 г. Беларускую псіхагістарычную асацыяцыю.

Пасля рэарганізацыі кафедры крыніцазнаўства ў 2001 г. ён працягвае працаваць на ёй у якасці прафесара, шчодра дзеліцца сваімі ведамі і досведам з новымі пакаленнямі даследчыкаў. У. Н. Сідарцоў падрыхтаваў двух дактароў і 11 кандыдатаў гістарычных навук.

Ад імя ўсіх вучняў і калегаў з гістарычнага факультэта жадаем Уладзіміру Нікіфаравічу дужага здароўя, бадзёрасці, поспехаў у педагагічнай працы і навуковай дзейнасці, новых творчых дасягненняў.

Старшы выкладчык
Сяргей КАЎН

СУПРАЦОЎНІЦТВА

На шляху да адукацыйных інавацый: паміж віртуальным і рэальным

Група калегаў Нацыянальнага даследчага Томскага дзяржаўнага ўніверсітэта (НД ТДУ) узяла ўдзел у міжнароднай канферэнцыі **«Дыскурс універсітэта–2015. Канструяванне адукацыйнай падзеі»**, арганізаванай Цэнтрам праблем развіцця адукацыі ГУВНМР.

Абмеркаванне адукацыйных падыходаў пачас круглага стала

На працягу 2014–2015 гг. была праведзена серыя навуковых эксперыментаў у Мінску, Гродне і Томску. Вялася праца ў інтэрнэце (віртуальны пленум, секцыі і форумы), інавацыйна-адукацыйныя пошукі ва ўніверсітэцкіх і школьных аўдыторыях. На самой канферэнцыі даследчыкі з НД ТДУ, ГрДУ імя Янкі Купалы і БДУ прааналізавалі эксперыментальныя распрацоўкі ў дадзеных установах.

Былі абмеркаваны даклады Аляксандра Палоннікава (БДУ) «Гісторыя, стан і перспектывы адукацыйных даследаванняў. Мінск – Гродна – Томск: 2000–2015 гг.», Вольгі Калачыкавай (НД ТДУ) «Формы арганізацыі адукацыйных падзей у зменлівым універсітэце». Вынікі эксперыментальнай працы былі адлюстраваны ў дакладах Таццяны Траццяковай (НД ТДУ), Аляксандры Саланенкі і Алены Сяргеевай (НД ТДУ), Аляксандра Колышкі, Жанны Волкавай (НД ТДУ), Наталлі Карчалавай (БДУ) і інш.

Прадстаўнік Томскай гарадской думы Ларыса Саракавая і дырэктар эксперыментальнай школы № 49 г. Томска Вольга Назарава закранулі праблему менеджменту адукацыйных інавацый. Асноўная выснова – неабходнае стратэгічнае адрозніванне ў кіраванні падтрымкай адукацыйнага ўзнаўлення і апераджальнага развіцця.

Жывую цікавасць у навуковай супольнасці выклікаў майстар-клас «Інавацыйная дыдактыка ў школе: ці можа настаўнік сучаснай школы стаць даследчыкам-практыкам?», на якім вядучыя Дзмітрый Кароль і Аляксандр Палоннікаў (БДУ) мадэлявалі працэдуру школьнага ўрока з выкарыстаннем візуальна і тэкстуальна апасродкаваных формаў навучальнай камунікацыі.

У выніку плённых дыскусій была сфарміравана праграма сумесных даследчых і практычных мерапрыемстваў на 2015/2016 навуч. год, якая аб'яднае навуковыя і педагагічныя калектывы БДУ, НД ТДУ, ГрДУ імя Я. Купалы і сярэдняй школы № 49 г. Томска. Запланаваны выданне навукова-педагагічнай літаратуры па праблеме адукацыйных інавацый у ВНУ і школе, арганізацыя сумесных семінараў і канферэнцый, стажыровак выкладчыкаў псіхолага-педагагічных дысцыплін.

Канферэнцыя стала чарговым этапам навуковай садружнасці беларускага і расійскага ўніверсітэтаў. Завяршэнне працы, аднак, не азначае завяршэнне дыялогу: ён будзе працягвацца анлайн.

Вольга ШАРКО,
Інэса ОСІПЧЫК

Конкурс грантаў падтрымкі сумесных даследаванняў з навуковымі, адукацыйнымі арганізацыямі і прадпрыемствамі В'етнама.

Праекты прымаюцца да 27 лістапада ў Галоўным упраўленні навукі БДУ (вул. Бабруйская, 9, каб. 306), электронную версію заяўкі варта накіраваць на e-mail: Shelamova@bsu.by (тэл. 209-53-24).

На конкурс прадстаўляюцца сумесныя ці ўзгодненыя з в'етнамскай арганізацыяй праекты па прыярытэтных кірунках навукова-тэхнічнай дзейнасці і фундаментальных даследаванняў. А таксама працы, накіраваныя на пашырэнне і паглыбленне навуковых ведаў, якія адрозніваюцца навізной і маюць навуковую і практычную значнасць.

Арганізатарам конкурсу з'яўляецца беларускае аддзяленне Беларуска-в'етнамскага інавацыйна-адукацыйнага і навукова-тэхналагічнага цэнтра.

Дадатковая інфармацыя пра патрабаванні да зместу і афармлення заявак гл. bsu.by/ru/main.aspx?guid=189641 ці па тэл.: 209-54-31.

АБ'ЯВЫ

«ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ» БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

СТАРШЫ НАВУКОВЫ СУПРАЦОЎНІК лабараторыі фізікі часціц

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.

ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: багаслоўя, біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння; рэлігіязнаўства.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: багаслоўя; біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, аддзел кадраў. Тэлефон: 327-55-71.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Вынікі конкурсу на суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі ў намінацыі «Навука» падведзены ў БДУ – Hand-embroidered10.rssing.com (29.10), megacat.by (30.10), БТ-1 (30.10).

Старшы выкладчык кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта БДУ Гардзей Хоміч стаў пераможцам III Міжнароднага конкурсу «Найлепшы настаўнік рускай славеснасці замежжа» – Hand-embroidered10.rssing.com, (27.10), БелТА, sb.by, sputnik.by, slutsk24.by (28.10), edu.gov.by, СТБ (29.10), БТ-1 (01.11), zviazda.by, «Звязда» (03.11).

«Дзень кар'еры – восень 2015» прайшоў у Беларускім дзяржаўным універсітэце – радыё «Сталіца» (13.10), budny.by (15.10), rss-catalog.net (21.10), БелТА, kv.by, ecopress.by (22.10), kudapostupat.by (23.10), БТ-1 / Добрай раніцы, Беларусь (28.10), zn.sb.by, «Знамя юности» (30.10), meetup.by (31.10), minsknews.by (02.11), studlive.by , ecopress.by, zviazda.by, «Звязда» (03.11), sputnik.by, minsknews.by, БТ-1, Мінск-ТБ (05.11), Tut.by (06.11).

«Акадэмія камунікацыі: PR і рэклама» адкрыла новы сезон у Беларускім дзяржаўным універсітэце – Hand-embroidered10.rssing.com (02.11), aif.by, БелТА, АНТ (04.11).

Тры каманды Беларускага дзяржаўнага універсітэта выйшлі ў паўфінал XVIII камандnага чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў – Megacat.by, kv.by (05/11), БТ-1 (4.11).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Старт для будучай кар’еры

Знайсці працоўнае месца маладому спецыялісту, ды яшчэ і без досведу, часам досыць складана. Але, хто веды даў, той і працаўладкавацца дапаможа. 5 лістапада БДУ правёў чарговы «Дзень кар’еры», на які ў галоўным корпусе ВНУ сабраліся сотні студэнтаў розных спецыяльнасцяў.

– Мерапрыемствы такога тыпу, як сёння, праводзяцца для таго, каб дапамагчы выпускнікам знайсці першае месца працы, гэта робяць усе ўніверсітэты ў свеце. Задача нашага ўніверсітэта не проста навучыць, а, як кажуць, выпусціць у свет, зрабіць усё, каб у нашых выпускнікоў у працоўным жыцці ўсё было добра, – адзначыў рэктар БДУ ***Сяргей Абламейка.***

Дзень кар’еры праводзіцца ўжо трэці год. І з кожным разам збірае ўсё больш працадаўцаў. На восеньскі кірмаш вакансій знайсці будучых супрацоўнікаў прыйшлі 14 айчынных і замежных арганізацый у сферы ІТ, лагістыкі, банкаўскай справы і бізнесу.

– Мы запрашаем паўдзельнічаць, безумоўна, усіх. Але адклікаюцца больш за ўсё прадстаўнікі бізнесу. У нас ёсць ужо пастаянныя партнёры-кампаніі, а ёсць пачаткоўцы, якіх з кожным годам усё дадаецца, – тлумачыць ***Наталля Няпеўная,*** начальнік управаўлення кадраў БДУ.

Дарэчы, Дзень кар’еры традыцыйна праводзіцца двойчы ў год: увесну і ўвосень. І калі першы кірмаш вакансій больш накіраваны на выпускнікоў ВНУ, якія вось-вось атрымаюць дыплом, то другі хутчэй разлічаны на студэнтаў, якія шукаюць месца стажыроўкі ці варыянт падзаробку.

– Наша кампанія займаецца распрацоўкай і тэсціраваннем праграмнага забеспячэння. Сёння мы можам прапанаваць студэнтам не толькі працу, але і стажыроўку, калі яны паклапоцяцца загадзя. Штогод да нас прыходзіць шмат студэнтаў на практыку. Бо гэта выдатны шанц выявіць сябе, атрымаць досвед і замацавацца ў кампаніі, а для кагосьці і праверыць, ці падыходзіць яму дадзены род дзейнасці, – распавядае ***Таццяна Давыдава,*** HR-спецыяліст Qulix systems, і дадае: – Патрапіць да нас маладому спецыялісту без досведу працы ў прынцыпе магчыма, галоўнае – жаданне вучыцца і працаваць.

Кампаніі разумеюць, што, супрацоўнічаючы са студэнтамі, неабходна падладжвацца пад іх навучальны працэс, таму ахвотна прапануюць працу з гнуткім графікам.

– Сёння ў нас адкрыты вакансіі ў кантакт-цэнтры для студэнтаў усіх курсаў. Да нас вельмі верагодна ўладкавацца, – распавядае начальнік аддзела рэкрутынгу МТБанка ***Кацярына Літвінка.*** – Для гэтага неабходна прайсці сумоўе са спецыялістам аддзела рэкрутынгу, а таксама папярэдняе навучанне. Пры гэтым графік працы будзе гнуткі. Студэнтаў мы не перагружаем, таму ў іх ёсць магчымасць сумяшчаць працу і вучобу.

Вядома, уладкавацца на працу за адзін дзень, хутчэй за ўсё, не атрымаецца. А вось аціць рынак прапаноў, зарэкамендаваць сябе і завязаць кантакты з магчымым працадаўцам – цалкам рэальна. Да таго ж не ўсе кампаніі на Дні кар’еры маглі прапанаваць месца працы, як той казаў, «тут і цяпер». Напрыклад, у вытворцы чыпсаў «Анега» на дадзены момант адкрытых вакансій няма, але анкеты пабач з іх стэндам студэнты ўсё адно запаўнялі з запалам.

– У нас на дадзены момант плануецца адкрыццё новай пляцоўкі завода, адпаведна, будзем пашыраць штат і ў першую чаргу плануем браць маладых спецыялістаў, – каментуе ***Кацярына Савіч,*** менеджар па персанале кампаніі «Анега». – Таму ўжо сёння прапаноўваем зацікаўленым студэнтам запоўніць анкету, з іх мы сфарміруем базу кандыдатаў, якіх па меры адкрыцця вакансій будзем запрашаць на сумоўе.

На працягу мерапрыемства кампаніі не толькі прэзентавалі сябе, але і тэсціравалі патэнцыйных супрацоўнікаў, праводзячы адразу на месцы міні-сумоўі. А таксама спецыялісты правялі шэраг *майстар-класаў,* дзе распавялі студэнтам, як, напрыклад, пісьменна скласці рэзюмэ, каб яго сапраўды заўважылі.

Не абышлося на восеньскім кірмашы вакансій і без новаўвядзенняў. Так, сярод студэнтаў прайшла *дзелавая гульня «Турнір будучых кіраванцаў»*, у якой яны змаглі прадэманстраваць свае веды і навыкі ў галіне кіраўніцтва і вядзення паспяховых перамоў. Спаборніцтва дазволіла не толькі студэнтам паказаць сябе ў справе, але і працадаўцам ацаніць прафесійныя якасці кандыдатаў. Таксама ў рамках мерапрыемства прайшоў *«Прадуктыўны нэтворкінг для старту паспяховай кар’еры»*, дзе студэнты сустрэліся з бізнесменамі і рэктарам БДУ і абмеркавалі з імі актуальныя пытанні, якія тычацца працаўладкавання.

Валерыя БАНДАРЧЫК

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Яшчэ фота і відэа gazeta.bsu.by

Цяжка быць рыцарам

Студгарадок не застаўся ўбаку ад святкавання дня нараджэння альма-матар і зрабіў для жыхароў інтэрнатаў два выдатныя падарункі.

28 кастрычніка былі падведзены вынікі круглагадовай спартакіяды і «Інтэрнатаўскіх спрэчак» за 2014/2015 навуч. год. А пасля каманды 7 інтэрнатаў пазмагаліся ў турніры BSU Battle Game, які прайшоў упершыню.

На працягу мінулага навучальнага года каманды 8 інтэрнатаў БДУ спаборнічалі ў 10 відах спорту, каб высветліць, які інтэрнат самы спартыўны. Вынікі такія: 1 месца – інтэрнат № 6, 2 месца – інтэрнат № 4, 3 месца – інтэрнат № 2.

Але не толькі спартсмены інтэрнатаў праяўлялі сябе ў спорце. Студэнцкія актывы інтэрнатаў заявалі ў спаборніцтвах у рамках Кубка дырэкцыі ў праграме «Інтэрнатаўскія спрэчкі». Перамогу ў гэтых спаборніцтвах атрымаў інтэрнат № 10, 2 месца за актывам інтэрната № 6, 3 месца за камандай «двойкі».

Усе пераможцы атрымалі каштоўныя і вельмі карысныя прызы (спартыўны інвентар і абсталяванне, спартыўная форма, настольны хакей і інш.), а пасля гэтага наступіла чарга доўгачаканага турніру BSU Battle Game, да якога, варта адзначыць, каманды пачалі рыхтавацца загадзя.

«Цяжка быць рыцарам» – да такой высновы мог прыйсці кожны, хто пабываў 28 кастрычніка на турніры BSU Battle Game паміж інтэрнатамі. 7 каманд па 10 чалавек заявалі за права звацца найлепшымі абаронцамі свайго «другога дома». Бітва вялася на халоднай (але бяспечнай) зброі Сярэднявечча – мячах, дзідах, луку са стрэламі.

Скажам сумленна: ніводная анлайн-гульня не параўнаецца запалам з мінулым турнірам. Мяркуйце самі: і мужнага выгляду хлопцы, і нават маленькія далікатныя дзяўчаты змагаліся з супернікамі «не на жыццё, а на смерць». У іх прачнуўся той самы інстынкт, які ў мінулым не даваў ваярам у страху пакінуць поле бою, і яны ваявалі да апошняга ўздыху.

«Суцішце свой тэстастэрон!» – заклікаў арганізатар з клуба Battlegame не толькі хлопцаў, якія ўсхадзіліся, але і дзяўчат. А калі справа дайшла да фінальных бітваў, паветра і ўвогуле вібравала ад напругі. Удзельнікі, ужо даволі стомленыя і мокрыя ад поту, павінны былі годна вытрымаць яшчэ па пяць сустрэч з супернікамі. У барацьбе за трэцяе месца перамаглі «Ліцвіны» з чацвёртага інтэрната.

Заставалася толькі дачакацца заканчэння бітвы паміж «Мядзведзямі» з сёмага інтэрната і «Вікінгамі» з «капейкі», каб даведацца пераможцу вечара. Скажам шчыра: фінальная бітва была тым яшчэ выпрабаваннем нерваў. Бітва за першае месца была самай напружанай, і пераможцам з яе выйшла «капейка». Трэба адзначыць, што «Вікінгі» ўнікальныя і тым, што годна адказалі на выклік зборнай оператрадаў інтэрнатаў, атрымаўшы перамогу і ў гэтай сутычцы!

Стомленыя, але задаволеныя прызёры атрымалі падарункі ад спонсараў – сеткі трэнажорных залаў «Адрэналін», «Тытан», «Алімпія», крамы спартыўнага харчавання «Эксперт», вытворцы вады «Баравая» і шматлікіх іншых. Кожная з каманд даказала, што не дасць свой «другі дом» у крыўду.

А асабіста вы – змаглі б праверыць сябе на ўстойлівасць і годна адказаць супернiку ў Battle Game?

Дар’я КАВАЛЬЧУК

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

16 лістапада 2015 года
Падпісана да друку 12.11.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by